# Журналістыка

*А. Г. СЛУКА*

## НААСФЕРА ВЯЛІКАГА СКАРЫНЫ

Прааналізаваны погляды Францыска Скарыны, якія паўплывалі на развіццё беларускай мовы, нацыі і дзяржавы.

In article the suggestions of F. Skaryna which had influenced to the process of rising Belarusian language, nation and state are analyzing.

***1. «Люди, и где зародилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имают…»***

Задуменна выводзіла гэтыя словы цвёрдая рука празорцы і мудраца, схіліўшагася над чарговай кнігай Святога Пісання. Погляд філосафа затрымаўся на стромкіх мурах Пражскага Града, і іх прыгажосць мроілася непаўторнасцю хараства Сафіі Полацкай, золатам незлічоных і велічных храмаў роднага і далёкага Полацка.

У душы Францыска Скарыны асаблівай пяшчотай загучала ўзнёслая і шчымліва-прызыўная музыка роднага краю, якая, здавалася, прагна цягнула неўтаймаванае сэрца на Радзіму, у Літву, у святы горад Полацк.

І тым не менш неабходна заўважыць, што скарынінская эпоха павярнула грамадскую думку да асэнсаванага ўдзелу асноўнай часткі насельніцтва, прасталюдзінаў, у грамадскім жыцці.

На Радзіме патрэбна было выпрацаваць новыя ідэалагічныя формы і метады суадносін у грамадстве ў той час, калі асабліва бурна развівалася адукацыя і навука, пачалося асваенне еўрапейскага і сусветнага вопыту арганізацыі жыццядзейнасці людзей і разам з гэтым павялічваліся палітыка-эканамічныя супярэчнасці ўнутры Вялікага Княства Літоўскага, а таксама канфлікты з блізкімі яго суседзямі. Час настойліва патрабаваў фарміравання спецыфічнай грамадска-палітычнай думкі ў асяроддзі асобнага славянскага народа, які ўжо тады пачынаў набываць сваю гістарычную і ўстойлівую назву.

У даскарынінскі час на Беларусі, ці дакладней – у ВКЛ, ужо існавала феадальная ідэалогія княжацкай улады, падмацаваная царкоўнымі законамі. Чалавек, асоба, асабліва з простага саслоўя, заставаўся па-за прававымі адносінамі і не карыстаўся статусам носьбіта грамадскай адказнасці: ён павінен быў падпарадкоўвацца і працаваць на свайго гаспадара. Фактычна гэта было становішча феадальнага рабства, якое імкліва дзяліла насельніцтва на саслоўі і класы. Гэта працэс аб’ектыўнага развіцця феадальнага грамадства.

У такі адказны перыяд беларускай гісторыі і была сфармулявана ідэалогія скарынінскай школы фарміравання беларускага этнасу ў ВКЛ як асноўнага і арганізуючага народа ў феадальнай дзяржаве. Падсумоўваючы вопыт Ф. Скарыны і яго ідэйных прадаўжальнікаў, яшчэ раз напомнім чытачу сапраўды геніяльную ідэалогію сцверджання шляхоў самастойнага развіцця беларускага народа. Неабходна адзначыць і падкрэсліць, што галоўныя ідэі эпохі Адраджэння супадаюць з высновамі Нацыянальнай ідэі, якую не толькі інтуітыўна, але і на высокім навуковым узроўні асэнсоўвалі выдатныя прадстаўнікі беларускай старажытнай філасофіі.

Па-першае, філасофскія погляды беларускіх асветнікаў грунтаваліся на захаванні свабоды і незалежнасці феадальнай краіны, якой з’яўлялася Вялікае Княства Літоўскае. Фундаментальныя прынцыпы арганізацыі старажытнага грамадства былі па-сапраўднаму рэвалюцыйнымі. Яны выходзілі далёка за межы існуючай княжацка-баярскай улады і прапанавалі грамадству пошук эфектыўных шляхоў арганізацыі свайго існавання. Першым крокам сацыяльнай рэгуляцыі было ўсталяванне гума-

ністычных адносін паміж людзьмі і кіруючымі структурамі, а таксама ўзвышэнне асобы над сярэдневяковымі антыправавымі адносінамі. Вось чаму і з'явіўся ў Вялікім Княстве Літоўскім знакаміты Статут ВКЛ. Па ідэалогіі скарынінцаў чалавек – вышэйшая істота пасля Бога і ён ёсць тварэц зямной благадаці.

Па-другое, скарынінская філасофская школа на аснове сцверджання гуманістычных адносін паміж людзьмі развівала ідэалы свабоды і справядлівасці ў ВКЛ і на падставе гэтага выхоўвала патрыятычныя пачуцці розных слаёў насельніцтва. Складваўся новы грамадзянскі падыход да ўнутрыдзяржаўных адносін з боку розных саслоўяў і стварэння спецыфічнага стылю жыцця беларускага народа ў Вялікім Княстве Літоўскім; асаблівая ўвага ў грамадска-палітычнай літаратуры надавалася развіццю свядомасці простых людзей, усяго насельніцтва.

Гэтаму спрыялі аб'ектыўныя фактары: асноўная тэрыторыя ВКЛ была беларускай і большасць насельніцтва таксама было беларускае; дзяржаўнай мовай зноў жа была беларуская. Такім чынам, нягледзячы на поліэтнічнасць насельніцтва ў феадальнай краіне, асноўным этнічным цэнтрам быў беларускі.

Да гэтых фактараў у канцы XV – пачатку XVI ст. далучылася магутная культурна-асветная плынь беларускага Рэнесансу. У першую чаргу гэта звязана з паяўленнем у беларускай гісторыі вялікага асветніка і філосафа Францыска Скарыны. Сваім жыццём і творчасцю, выдавецкай справай ён заснаваў маральна-этычны, духоўны ідэал беларускага народа, асноўныя нормы і каштоўнасці якога дайшлі да нас у першапачатковым выглядзе.

З'яўленне на Беларусі першадрукара, вялікага асветніка і філосафа Адраджэння Францыска Скарыны было не выпадковым. У феадальным грамадстве XVI ст. склаліся ўмовы пераходу еўрапейскіх народаў да асваення ідэй гуманізму і Рэнесансу.

У гэты час на тэрыторыі Беларусі ўлада належала князям і царкве. Духавенства таксама амаль поўнасцю падпарадкоўвала сабе культуру. Царква пільна сачыла за выкананнем сваіх дагматаў у грамадстве, і гэта было адной з форм падпарадкавання і заняволення насельніцтва; у той жа час духавенства выступала амаль адзінай сілай, якая развівала асветніцтва, фарміравала маральна-этычныя нормы і грамадскую свядомасць чалавека.

Значны ўплыў на насельніцтва ў ВКЛ аказвалі рэлігійныя канфесіі. Гэта праблема ў залежнасці ад поглядаў тых ці іншых князёў, палітычнай кан'юнктуры магнацкіх груповак узмацнялася або паслаблялася. Вядома, што каталіцкае насельніцтва на Беларусі заўсёды складала значную меншасць. І калі ў 1386 г. вялікі князь Ягайла прыняў каталіцтва, то праваслаўных аб'явілі «схізматыкамі» і з 1400 г. пазбавілі асноўных грамадзянскіх правоў. У пастанове Гарадзельскага сейма (1413 г.) гаварылася, што схізматыкі (праваслаўныя) і іншыя няверныя не могуць займаць ніякіх вышэйшых пасад у дзяржаве.

Але гэта толькі выніковы факт, які падкрэсліваў змену палітычных арыенціраў у Вялікім Княстве Літоўскім. Ягайлаўская акцыя была накіравана на радыкальны паварот дзяржавы ад ідэалогіі беларускай (праруской) арыентацыі да прапольска-каталіцкай. Была заканадаўча абгрунтавана стратэгічная апаслівасць да далейшага гістарычна аб'ектыўнага развіцця беларускага народа і пачалася эпоха гвалтоўнай асіміляцыі карэннага насельніцтва ВКЛ. У працэс фарміравання свядомасці насельніцтва поліэтнічнай дзяржавы быў штучна ўнесены канфліктны элемент, які замацаваўся ў гісторыі як пастаянны палітычны фактар супрацьстаяння двух веравызнанняў.

Фактычна з гэтага часу пачынаецца ўпартая і несупынная канфесійная барацьба, якая наносіла вялікую шкоду працэсу фарміравання беларускай нацыі. Масавае праваслаўе выступала супраць уладнага і афіцыйнага каталіцызму з яго адвечным імкненнем распаўсюдзіць свой уплыў праз Беларусь, Украіну далей на Усход. Аднак гэта відавочная задача ўступала ў супярэчнасць з філасофіяй праваслаўя, якая злівалася, па сутнасці, з паняццем народнасці, этнасу, нацыі. Каталіцызм у сваім старажытным выглядзе не толькі пазбаўляў народ Вялікага Княства Літоўскага гістарычнай веры, але перашкаджаў і руйнаваў нацыянальныя прынцыпы фарміравання беларускай супольнасці. Падкрэслім, што праваслаўныя і каталікі беларусы і палякі каталікі пастаянна захоўвалі ўзаемапавагу і другасныя адносіны, пакуль у гэты працэс не ўмешваліся палітычныя партыі і авантурныя палітыкі.

Акрамя гэтага, на пачатку XVI ст. на Беларусь пранiклі ідэі кальвінізму і лютэранства, а таксама пратэстанцкія погляды чэшскага асветніка Яна Гуса, якія мелі даволі шырокі ўплыў і на частку насельніцтва ВКЛ. Аб гэтым гаворыць і той факт, што многія маладыя людзі з беларускіх земель ехалі вучыцца ў еўрапейскія ўніверсітэты – Пражскі, Кракаўскі, Падуанскі і інш. Адным з такіх «шукальнікаў асветы» і стаў Францыск Скарына са «слаўнага горада Полацка».

Трэба адзначыць, што грамадска-палітычная думка, асвета і культура на Беларусі ў той час развіваліся даволі інтэнсіўна ў рэчышчы агульнаеўрапейскага Рэнесансу. Працэс развіцця культуры

ўсё выразней выяўляў нацыянальныя патрыятычныя матывы, што, у сваю чаргу, уплывала на самасвядомасць беларускага народа, які ўсё больш асэнсоўваў сябе этнічнай еднасцю на пэўнай геаграфічнай тэрыторыі.

Шлях да агульнаеўрапейскага Адраджэння пралягаў праз асвету, адукацыю людзей. Гэта быў аб'ектыўны напрамак удасканалення грамадства і чалавека. Ідэалістычны метад пазнання паступова эвалюцыяніраваў да матэрыялістычнага ўспрымання прыроды сусвету, заняў першасныя пазіцыі ў філасофіі. У такіх грамадска-палітычных абставінах сфарміравалася дзейнасць беларускага гуманіста Францыска Скарыны.

Асоба Ф. Скарыны як дзеяча беларускага, славянскага і агульнаеўрапейскага Адраджэння нават сёння ў поўнай меры не асэнсавана. Нягледзячы на даволі значную літаратуру, прысвечаную аналізу розных бакоў яго дзейнасці, яшчэ не створана цэласная канцэпцыя яго феномена, вызначаны не ўсе дасягненні генія Ф. Скарыны ў беларускай і еўрапейскай культуры. Не дастаткова вывучаны філасофскія, рэлігійныя, грамадскія погляды і матывы творчасці вялікага асветніка, які адкрыў сапраўды новую інтэлектуальную эпоху пачаткам кнігадруку, распаўсюджаннем найбольш вядомых і масавых выданняў і заснаваў пачатак фарміравання самасвядомасці беларусаў на навуковай аснове. Падкрэслім: Ф. Скарына адкрыў кнігадрукаванне на Беларусі і быў цвёрда ўпэўнены ў тым, што кніга ўздымае чалавецтва на новую ступень цывілізацыі праз фарміраванне рэалістычных светапоглядаў грамадства.

Ф. Скарына ўсё жыццё рупіўся аб сваёй радзіме і працаваў на карысць беларускага народа. Найярчэйшы прыклад павагі і любові да роднай зямлі даў слынны беларус сваім нашчадкам – сучаснаму маладому пакаленню.

Неабходна ўзнавіць у памяці гуманістычныя ідэі духоўнага настаўніка беларускай нацыі, які ці не першым ацаніў каштоўнасць навукі і культуры і на гэтай аснове цэласнай сістэмай поглядаў і практычнай дзейнасцю на ніве асветы заклаў падмурак Адраджэння ў ВКЛ. «Всяко писание богом вдъхненое полезно <...> Да совершен будеть человек божий и на всяко дело добро уготован», – пісаў ён (цыт. па: Дварчанін 1991, 17).

### *2. «Не многим учителем бывати, но более умети язык свой справовати...»*

«Біблія» Ф. Скарыны стала адной з самых ранніх у славян і першай сярод усходніх славян кнігай, пісанай не па-царкоўнаславянску, а ў перакладзе з чэшскай на старабеларускую мову. Адзначым яшчэ раз, што вялікі асветнік друкаваў свае кнігі на беларускай мове! Здабыткі этнічнай культуры, высокі агульнаадукацыйны ўзровень, а таксама высокаразвітая грамадская свядомасць на беларускіх землях былі падставай для такога гістарычна-вызначальнага дасягнення.

Ф. Скарына падкрэсліваў і развіваў самабытнасць свайго народа. Яго творчасць і кнігадрукаванне асноўваліся на «рускай», старабеларускай мове. Гэта была магутная грамадская пазіцыя, якая стварыла фундамент навуковага развіцця беларускага этнасу ў сярэдневяковыя часы. Першадрукар усходніх славян «размаўляў» з грамадствам на кніжнай беларускай мове. Адтуль, несумненна, набірала моц наша родная мова, каб не знікнуць у пазнейшы неспрыяльны час каланіяльнага ўціску.

Філосаф эпохі Адраджэння Ф. Скарына і яго паслядоўнікі навукова асэнсавалі неабходнасць асваення і развіцця беларускай мовы. Акрамя вядомых абгрунтаваных доказаў, што мова – «душа народа», беларускія асветнікі сцвярджалі, што пашырэнне ўжытку беларускай мовы кансалідавала карэнны этнас у ВКЛ і было тым маральна-этычным фактарам, які вызначаў беларусаў сярод іншых народаў. Цікава прапанаваць чытачу гіпотэзу для роздуму, па якому шляху пайшло б развіццё беларускага народа, калі б у нашай гісторыі не з'явіўся мудры празорца Францыск Скарына. І хаця гісторыя не мае зваротнага ходу, аднак карціна атрымліваецца вельмі змрочная. Разам з тым скажам, што ў гэтай антыідэі нам нельга схавацца за супакойваючае: не было б Скарыны – быў бы нехта іншы! Магчыма, хтосьці і быў бы, але не вялікі Францыск Скарына з Полацка. Тады не атрымалася б такога магутнага прарыву ў беларускай навуцы, адукацыі, кнігадрукаванні, не з'явілася б такой моцнай падтрымкі развіцця беларускай мовы і заснавання філасофіі развіцця самога беларускага этнасу.

Асабліва значны перыяд дзейнасці Ф. Скарыны працякаў на радзіме. У 1520 г. ён стварыў у Вільні друкарню і ў 1525 г. выдаў там шырокавядомыя кнігі «Апостал» і «Малая падарожная кніжыца». Адкрыццё друкарні ў Вялікім Княстве Літоўскім азначала не толькі пачатак выпуску кніг – друкаванае слова выходзіла з манастырскіх сцен і княжацкіх палацаў да простых людзей. Гэты працэс быў цяжкі, супярэчлівы і нават трагічны, але кніга намаганнямі Ф. Скарыны і яго паслядоўнікаў паволі рушыла насустрач «людем посполитым к доброму научению», як гэтага жадаў сам вялікі асветнік. У гэтых кнігах «есть справедливость, – пісаў Ф. Скарына ў прадмове да «Псалтыра». – Там есть чистота душевная и телесная. Там есть наука всякое правды. Там мудрость и разум доскональй. Там есть милость и друголюбство без льсти; и все иншии добрые нравы, яко бы со источника, оттоле походять…».

Такі гуманістычны маральны кодэкс сфармуляваў Ф. Скарына ў сваіх творах, які высноўваўся, несумненна, на агульначалавечых каштоўнасцях, але быў мэтанакіраваны на чалавека і грамадства ВКЛ (гл. Дварчанін 1991, 17).

Погляды Ф. Скарыны, сфармуляваныя ў яго прадмовах, тлумачэннях, аўтарскіх рэмарках і адступленнях, з'яўляюцца філасофскай публіцыстыкай народнага асветніка. Ён нібыта ішоў далей тых поглядаў і ідэй, што ўтрымліваліся ў кананічным змесце надрукаваных ім царкоўных кніг. Пры ўважлівым разглядзе скарынінскіх твораў яскрава прасочваюцца гуманістычныя ідэі, якія сталі моцным штуршком у развіцці беларускай культуры, мовы і філасофіі (гл. Слука 2008, 57).

Скарынінскі Рэнесанс – найважнейшая стваральная эпоха для фарміравання фундаментальных асноў беларускай нацыі: тады быў нададзены імпульс навуковага паскарэння працэсам развіцця беларускай мовы і ўсталявання прынцыпаў самастойнай дзяржавы. Важнейшыя кампаненты Нацыянальнай ідэі ўжо ў той час праявіліся вельмі яскрава. Але нам трэба помніць, што беларуская мова, нягледзячы на тое, што яна мела дзяржаўны статус у Вялікім Княстве Літоўскім, знаходзілася ў стадыі свайго станаўлення, як фактычна толькі разварочваўся і працэс фарміравання беларускай народнасці. Не было ў поўнай меры беларускім, як вядома, і ВКЛ, якое аб'ядноўвала ў сваім складзе многія народы ўсходняй і цэнтральнай Еўропы. Такім чынам, у той далёкі старажытны час адбывалася назапашванне колькасных і якасных грамадскіх характарыстык для фарміравання беларускай нацыі ў пазнейшыя часы нацыянальнай гісторыі.

І зразумела, што самым магутным сродкам усведамлення Нацыянальнай ідэі з'явілася акрэсленае развіццё ў часе беларускай мовы. Мова, нацыя, дзяржаўнасць ляжаць у падмурку свабоднага развіцця кожнага этнасу, а таксама ўсведамлення грамадскай думкай Нацыянальнаці ідэі. Гэта – закон развіцця грамадства, кожнай нацыі і народа ў прасторы і часе (гл. Гісторыя 1968 І, 170).

Беларуская мова стала асноўным арганічным фактарам сувязі ўсіх праяў дзейнасці чалавека, усяго грамадства ВКЛ. Наша родная мова знітавала лёс народа на Богам вызначанай тэрыторыі і фактычна ўзроўнем свайго развіцця вызначыла гістарычны перыяд узнікнення Нацыянальнай ідэі – асноўнага закону аб'яднання і развіцця беларускага народа ў рэчышчы еўрапейскай цывілізацыі.

Моўны фактар у спалучэнні з сацыяльна-эканамічным з'яўляецца характэрным паказчыкам узроўню развіцця грамадства, яго самасвядомасці і прыналежнасці кожнага асобнага чалавека да канкрэтнага народа. Адсюль вынікае, што мова – гэта філасофскі механізм запуску асабліва актыўных сіл грамадства, якія фармулююць маральна-этычныя законы яго развіцця.

***3. «Всякому человеку потребна чести»***

Сфармуляваныя ў публіцыстыцы Ф. Скарыны грамадска-палітычныя і культуралагічныя ідэі і канцэпцыі маюць фундаментальную, класічную каштоўнасць. У філасофскіх артыкулах ён абгрунтоўвае неабходнасць выхавання ў людзях пачуцця нацыянальнай свядомасці – і не для нейкай абстрактнай фармальнай мэты, а для абароны інтарэсаў свайго краю, сваёй хрысціянскай веры.

Беларускі гуманіст сфармуляваў маральныя законы і прынцыпы развіцця грамадства і паводзін чалавека ў ім. Выхаванне людзей, служэнне народу, навучанне дзяцей, фарміраванне ў іх пачуцця патрыятызму хвалявалі асветніка. Многія яго вывады гучаць актуальна і ў наш час.

Адназначна фармуляваў свае погляды Ф. Скарына адносна неабходнасці пашырэння асветы: «людем простым посполитым к пожитку и ко размножению добрых обычаев» прызначаліся яго кнігі; «людем посполитым рускаго языка к доброму научению» і «к учению и ко обличению, исправлению и ко наказанию правды». Такі падыход да тлумачэння адносін паміж грамадствам і чалавекам, чалавекам і культурным асяроддзем стварaў гуманістычную філасофію новага часу, быў асновай для развіцця беларускага грамадства і, галоўнае, даваў падставу для фарміравання ўстойлівай грамадскай свядомасці. «Тые же вси первомснованые писма, – пісаў Ф. Скарына, – кажьное с них токмо едину речь в собе замыкаеть; яко закон живота вечного людей доступити учить, пророци приидущее доброе добрым, а злое злым проповедують; деяния же и животы светых отець жити нас на свете в боязни божией и в терпении навчають; притчи так и приповести премудрых учителев добрых обычаев младых и старых наставляють» (цыт. па: Дварчанін 1991, 17).

А самае галоўнае, і гэта неабходна падкрэсліць, выдатны беларускі асветнік і яго аднадумцы стварылі ў сваёй творчасці  пазнавальны вобраз беларускага народа. З'ява гэта сімвалічная. Вобраз беларускага народа набыў прываблівыя рысы, узятыя мастакамі з рэальнай сучаснасці, і быў заснаваны на гістарычных славянскіх традыцыях, глыбокай веры ў Хрыста, законах маралі і этыкі старажытнага грамадства. У «кніжным» вобразе беларускага народа, створаным таленавітымі мастакамі, захаваліся да нашага часу класічныя рысы нацыянальнага характару. І важна тут адзначыць, што сярэдневяковыя беларускія мысліцелі акцэнтавалі ў грамадскай думцы існаванне самастойнага народа на канкрэтнай тэрыторыі з характэрнымі антрапалагічнымі асаблівасцямі, вызначальнымі еўрапейскімі дасягненнямі ў развіцці гаспадаркі, эканомікі і культуры.

Стварэнне літаратурнага вобраза беларускага народа стала магчымым таму, што ў той час ужо выразна праявіліся характэрныя і адметныя рысы самастойнай беларускай этнічнай індывідуальнасці: беларуская мова, верацярплівасць (два асноўныя веравызнанні ў адной краіне), талерантнасць, што стварала аснову фарміравання свядомасці асобы ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Ф. Скарына «навучыў» беларусаў патрыятычнаму адчуванню свайго роднага краю і стварыў ідэал Радзімы, вакол якога і фарміравалася высокая свядомасць кожнага грамадзяніна. Паэзія нацыянальных каштоўнасцей была сцверджана ў высокаадукаванай творчасці асветнікаў эпохі Рэнесансу як новая плынь грамадскай свядомасці людзей феадальнай дзяржавы. «Всякому человеку потребна чести, – пісаў Ф. Скарына, – понеже ест зерцало жития нашего, лекарство душевное, потеха всем смутным, наболей тым, они же суть в бедах и в немощах положены, надежа истинная востания из мертвых и вечного живота» (цыт. па: Дварчанін 1991, 17).

У абвастрыўшымся сацыяльным канфлікце паміж феадаламі і прасталюдзінамі творчасць Скарыны і яго школы аб'ектыўна стаяла на гуманістычных пазіцыях, адлюстроўвала рэальныя карціны жыцця феадальнага грамадства і шукала выйсце з сацыяльных супярэчнасцей у сцверджанні справядлівасці. Такі падыход да асэнсавання рэчаіснасці адкрываў новыя магчымасці суадносін людзей з уладай, царквой і іншымі грамадскімі інстытутамі. У працэсе фарміравання грамадскай свядомасці адбыўся інтэлектуальны эвалюцыйны пераварот.

Чалавек пачаў усведамляць сябе Божым сынам, свабоднай істотай, стаў крытычна адносіцца да ролі княжацкага халопа, бяспраўнага выканаўцы гаспадарскай волі і асэнсоўваў гэта як сацыяльную несправядлівасць. Адсюль пайшло абвастрэнне маёмаснага размежавання людзей на беларускай тэрыторыі, паступова пашыраліся і ўмацоўваліся сацыяльныя класы, якія супрацьстаялі адзін аднаму. Зразумела, што гэта аб'ектыўны працэс. У той жа час гэта нішто іншае, як фарміраванне спецыфічнай класавай свядомасці, праз перыяд якой прайшло ўсё чалавецтва.

Не мінула гэта з'ява і беларусаў, хаця рабства ў чыстым выглядзе, так бы мовіць, мы ў сваёй гісторыі не адзначаем. Рабства праяўлялася ў бяспраўнасці прасталюдзінаў перад сваімі ўладальнікамі. І не хочацца паўтараць прыклады з гісторыі, але насельніцтва, нават жыццё асобнага чалавека залежала ў сярэднявеччы ад волі феадалаў. А гэта вымушала сялянства «бунтаваць» супраць прыгнятальнікаў і адстойваць свае правы ў жорсткіх класавых бойках.

Аднак, перш чым узняць сякеру і вілы ў сацыяльным канфлікце, кожнаму чалавеку патрэбна было зразумець узровень бяспекі сябе і сваёй сям'і ў бойцы супраць заўсёды больш моцнага супраціўніка, у якога была ўлада і воінская сіла. І калі надараліся выступленні насельніцтва супраць феадалаў, значыць, у свядомасці людзей назапашвалася столькі злосці, нецярплівасці і несправядлівасці, што гэта пераадольвала страх за свой лёс, а каштоўнасць жыцця была несумяшчальная і з жабрацтвам, і з бяспраўем, а галоўным сэнсам існавання лічылася мэта ўстанаўлення справядлівасці. Мы можам сцвярджаць, што адсюль і пайшло свабодалюбства беларусаў. Часта было ў гісторыі так, што церпяць яны церпяць несправядлівасць, але як нахабства заваёўнікаў і прыгнятальнікаў пераходзіць ва ўсеагульную пагрозу, то тады яны дзейнічаюць па класічнай устаноўцы мудрага Якуба Коласа: «Я маўчу, маўчу, трываю, але скора загукаю: "Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!"».

Гэта была сярэдневяковая дэмакратычная ідэалогія ўзвышэння чалавека ў іерархіі феадальнага грамадства, скажам так – гуманістычнага Рэнесансу. У моцнай скарынінскай плыні ўмацавання беларускага свядомаснага падмурка нездарма з'явіліся таленавітыя яго паслядоўнікі, якія ўжо не толькі развівалі асветніцкія, можна сказаць, – беларускія ідэі, але ў сваёй публіцыстыцы яны адстойвалі правы беларускага народа на сваю мову, Радзіму, адукацыю, праваслаўную царкву і сацыяльную справядлівасць. Несумненна, што гуманістычная філасофія беларускіх асветнікаў уплывала на лібералізацыю сацыяльна-эканамічнай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага, спрыяла развіццю агульнага адукацыйнага працэсу і стымулявала з'яўленне зводу дзяржаўных законаў у вядомых Статутах ВКЛ.

### *4. «Не многим учителем бывати, но более умети язык свой справовати...»*

Ф. Скарына – таленавіты нацыянальны самародак. Свае энцыклапедычныя веды ён распаўсюджваў на ўсе сферы дзейнасці грамадства і ўнёс значны ўклад у распрацоўку канцэпцыі развіцця беларускай мовы. Хаця патрэбна адзначыць, што вучоныя і літаратары, даследчыкі творчасці Ф. Скарыны сціпла гавораць аб гэтай тытанічнай працы. Ён пачаў друкаваць беларускія кнігі, увёў родную мову ў рэлігійную літаратуру, імкнуўся да таго, каб яго выданні «Бібліі» і іншых кніг былі зразумелымі шырокаму колу чытачоў. Напісанае Ф. Скарынам «не многим учителем бывати, но более умети язык свой справовати…» у «Апостале» застаецца сугучным сённяшняму дню і назаўсёды слушным для беларусаў, ды і ўвогуле для кожнага народа. На гэтай падставе мы падзяляем заключэнне даследчыкаў аб тым, што «мова скарынінскіх кніг з'яўляецца літаратурнай беларускай мовай пер-

шай паловы XVI стагоддзя. Яна была народнай у сваёй аснове, таму “Біблію” Ф. Скарыны справядліва лічаць скарбніцай народнай мовы» (Гісторыя 1968 I, 170).

Такім чынам, праца Ф. Скарыны па кніжнаму распаўсюджанню роднай мовы зачынала і пашырала працэс фарміравання беларусаў у асобную нацыю сярод славянскіх народаў. Гэты працэс паскараўся адэкватна таму, як хутка развівалася адукацыя і асвета ў Вялікім Княстве Літоўскім. А працэс гэты быў даволі інтэнсіўны і эфектыўны. Вядома, што маладыя і забяспечаныя людзі атрымалі магчымасць вучыцца ў еўрапейскіх універсітэтах. І цяга да вучобы была такая магутная, што на Радзіму вярталіся таленавітыя вучоныя і мастакі, літаратары і дзяржаўныя дзеячы. Паступова фарміравалася высокаадукаванае духоўнае асяроддзе ў ВКЛ, якое змагло заснаваць і развіць нацыянальную асвету, літаратуру, навуку і мастацтва. А гэта, у сваю чаргу, уплывала на станаўленне нацыянальнай самасвядомасці на асэнсаваным навуковым узроўні.

Беларускі падзвіжнік Ф. Скарына быў найбольш таленавітым прадстаўніком свайго часу. Аднак у сваіх філасофскіх і грамадска-палітычных поглядах ён далёка абагнаў сярэднявечча, указаў на неабходнасць развіцця навукі і асветы, чаму ён сам самааддана служыў; лічыў важнейшай справай распаўсюджанне славянскай культуры, умацаванне хрысціянскай веры і маралі: «Христианство наше не толико именем и крещением, но братолюбием и незлобием совершается», – несупынна сцвярджаў Ф. Скарына. Сучаснікам неабходна паўтараць гэта як малітву, бо іменна Ф. Скарына прыдаў асабліва моцны навуковы імпульс станаўленню беларускага этнасу.

У той жа час інтэнсіўнае развіццё беларускай мовы было таксама своеасаблівым рухавіком паскарэння агульнай культуры ўсяго Вялікага Княства Літоўскага. Чым вышэй уздымаўся па ступенях цывілізацыі беларускі этнас, тым большы грамадскі здабытак атрымлівалі іншыя народы ВКЛ. Гэта безумоўная ісціна. Асноўная этнагрупа нібыта «цягнула ў прагрэс» за сабой іншыя этнасы, што з’яўлялася ўзаемаабагачальным працэсам развіцця феадальнай дзяржавы.

Кароткая размова пра «тытана духу» заўсёды тоіць у сабе нешта недасказанае і вельмі важнае. Але ў нашым апавяданні без усякага сумнення эпоха Ф. Скарыны – гэта інтэлектуальны прарыў нацыянальнага самавызначэння. Да беларускага асветніка наша зямля была ў стане старажытнай натуральнай гаспадаркі і змрочнага палітычнага сярэднявечча, а Ф. Скарына і школа яго падзвіжнікаў прыдалі такое імклівае паскарэнне цывілізаванаму працэсу, што ў некаторых галінах сацыяльна-эканамічнага развіцця Вялікае Княства Літоўскае абганяла агульнаеўрапейскае супольніцтва.

Ф. Скарына стаяў ля вытокаў беларускага кнігадрукавання, такім чынам адказваючы на выклік часу і пачатак імклівага развіцця індустрыяльнай рэвалюцыі. Ён быў непахісным патрыётам полацкай – беларускай зямлі і свае таленавітыя дасягненні ў розных сферах чалавечай жыццядзейнасці запісаў на беларускай мове. Такая адна з гістарычных заслуг незвычайнага празорцы. Ф. Скарына «даў» беларускаму народу яго самастойную мову, самую вышэйшую ўзнагароду ад Бога. Ён узвёў народную гутарковую мову на п’едэстал мастацкага, літаратурнага ўвасаблення.

Духоўны настаўнік беларускай нацыі Францыск Скарына сілай свайго таленту і асабліва празорлівым поглядам у будучыню заснаваў на Беларусі магутную асветную камунікацыйную плынь, якая стала гуманістычнай асновай фарміравання беларускай нацыі і самых сучасных сацыяльных грамадскіх інстытутаў, у тым ліку і перыядычных выданняў. Ужо ў 1562 г. у Нясвіжскай друкарні выйшла першая на Беларусі прагазета «Навіны грозныя…», якая разам з еўрапейскімі выданнямі падобнага тыпу з’явілася першаасновай стварэння перыядычнага друку. Публіцыст Ф. Скарына фактычна распачаў эпоху нацыянальнай журналістыкі.

Уся дзейнасць Францыска Скарыны была скіравана на свядомаснае ўспрыманне чалавекам рэчаіснасці праз медыцыну, мову, кнігу, веру... Крэда вялікага асветніка заключалася ў сцверджанні зямной справядлівасці. Менавіта скарынінская рэнесансная эпоха ўзняла самасвядомасць этнасу на такую вяршыню, з вышыні якой на гарызонце беларускай нацыі ўжо засвяцілася святая назва – Белая Русь.

ЛІТАРАТУРА

Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мінск, 1968.
Дварчанін І. С. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве. Мінск, 1991.
Слука А. Г. Нацыянальная ідэя. Мінск, 2008.

Паступіў у рэдакцыю 17.10.12.

*Алег Георгіевіч Слука* – доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ.